*М.А.БЯСПАЛАЯ*

# СТАНАЎЛЕННЕ ПАЛІТЫЧНАГА І КУЛЬТУРНАГА АСВЕТНІЦТВА Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (верасень 1939 – чэрвень 1941 гг.)

*Пасля аб'яднання з БССР Заходняй Беларусі на тэрыторыі апошняй хутка распаўсюджваюцца формы і метады сістэмы палітыка- і культурна-асветніцкай дзейнасці, напрацаваныя ў СССР за два дзесяцігоддзі савецкай улады. Разглядаючы гэты працэс, аўтар раскрывае яго прычыны і вынікі.*

Семдзесят гадоў аддзяляюць нас ад падзеі выключнай важнасці для беларускага народа – аб'яднання яго ў адзінай краіне – БССР. Гэты працэс адбываўся ў складаных міжнародных абставінах і ў цяперашні час выклікае неадназначную ацэнку, якая абумоўлена перш за ўсё фактам падпісання 23 жніўня 1939 г. дагавора аб узаемным ненападзе паміж СССР і Германіяй і сакрэтнага пратакола да яго аб сферах уплыву гэтых дзяржаў.

Ва ўмовах Другой сусветнай вайны, якая пачалася 1 верасня 1939 г. з нападу Германіі на Польшчу, калі ўжо галоўныя сілы польскай арміі былі разбіты і ўрад пакінуў краіну, а германскія войскі падышлі да заходнебеларускіх земляў, войскі Чырвонай Арміі атрымалі загад перайсці савецка-польскую мяжу і ўзяць пад абарону жыццё і маёмасць мясцовага насельніцтва гэтых земляў. 17 верасня 1939 г. пачаўся вызваленчы паход Чырвонай Арміі, і на працягу тыдня яе войскі занялі Заходнюю Беларусь. Па-рознаму гэтую падзею ацэньваюць у свеце, мы яе разглядаем з пазіцыі беларусаў, таму што яна датычылася непасрэдна нас. І як ужо адзначалася, для беларускай нацыі гэта была знамянальная падзея, таму што здзейснілася гістарычная справядлівасць і адбылося аб'яднанне беларускага народа ў адзінай дзяржаве. Нядоўгім быў мірны час. 22 чэрвеня 1941 г. пачалася Вялікая Айчынная вайна.

У гэты час, з 17 верасня 1939 г. па 22 чэрвеня 1941 г., наладжвалася жыццё ў Заходняй Беларусі ў прынцыпова новых для яе палітычных і сацыяльна-культурных умовах. Адзначым, што большасць заходнебеларускага насельніцтва з энтузіязмам сустракала Чырвоную Армію, звязваючы з яе прыходам хуткія перамены да лепшага. Асабліва актыўна далучалася да новага парадку маладое пакаленне, перад якім адкрываліся дагэтуль невядомыя і немагчымыя перспектывы ва ўсіх сферах жыцця – ад палітыкі да культуры.

З прыходам Чырвонай Арміі на тэрыторыі Заходняй Беларусі пачалося стварэнне першапачаткова часовых, а з пачатку 1940 г. і пастаянных органаў савецкай улады. Першыя крокі савецкай улады: нацыяналізацыя прадпрыемстваў і банкаў, скасаванне ўсіх запазычанасцей Польскай дзяржаве, наладжванне працы існуючых і адкрыццё новых прадпрыемстваў і скарачэнне беспрацоўя да мінімальнага ўзроўню – успрымаліся прыхільна. Па ініцыятыве сялянскіх камітэтаў і пры падтрымцы большасці сялянства, асабліва бедняты, былі падзелены памешчыцкія і царкоўныя землі, жывёла, насенны фонд. Станоўчыя змены адбыліся ў медыцынскім абслугоўванні насельніцтва, у галіне народнай асветы. Ствараліся новыя школы, значная колькасць іх пераводзілася на беларускую мову, пачалі дзейнічаць настаўніцкія інстытуты ў Гродне, Баранавічах, Пінску, Беластоку і іншых гарадах, а таксама 25 сярэдніх спецыяльных устаноў, вырасла колькасць бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Безумоўна, такія мерапрыемствы савецкай улады не маглі не атрымаць падтрымкі насельніцтва. Выразным прыкладам яе можа стаць добраахвотнае стварэнне калгасаў у многіх раёнах ужо вясной 1940 г. На падставе архіўных даных аўтар артыкула сведчыць, што ў яе роднай вёсцы на Піншчыне гаспадары ўсіх 170 двароў у сакавіку 1940 г. уступілі ў калгас і назвалі яго "17 верасня" [1д, л. 2]. Восенню 1940 г. працэс арганізацыі калгасаў набыў больш хуткі тэмп. Для іх абслугоўвання ствараліся машынна-трактарныя станцыі, на курсах трактарыстаў і камбайнёраў навучаліся сотні хлопцаў і нават дзяўчаты.

Аднак не ўсе крокі савецкай улады аказаліся бездакорнымі і гуманнымі. Ужо ў лютым 1940 г. пачалася першая хваля неабгрунтаванага высялення спачатку былых памешчыкаў, асаднікаў, чыноўнікаў, часткі кулакоў, а па меры заснавання калгасаў і адводу ім лепшых земляў і часткі сялян, якія супраціўляліся гэтаму. Эмацыянальная хваля відавочнага поспеху, сацыяльна-класавая рыторыка прадстаўнікоў савецкай улады садзейнічалі праяўленню і крайняга рэвалюцыйнага экстрэмізму, у выніку якога пацярпела шмат дастойных людзей. Яркі прыклад – лёс сям'і Скірмунтаў з маёнткаў Моладава і Парэчча, недалёка ад Пінска, члены якой загінулі ў вельмі сталым узросце ад рук некалькіх чалавек, чымсьці не задаволеных. Сярод загінуўшых быў і Раман Скірмунт, былы дэпутат Дзяржаўнай думы, сябра Дзяржаўнага савета, актыўны дзеяч Мінскага таварыства сельскіх гаспадароў, прадбачлівы і таленавіты прадпрымальнік, стваральнік алфавіта палеска-пінскага дыялекту, і інш.

Названыя працэсы ў Заходняй Беларусі адлюстроўваюць крайнюю складанасць сітуацыі, перш за ўсё сацыяльна-псіхалагічнай, якая яшчэ чакае свайго даследчыка.

Важная роля ў забеспячэнні масавай падтрымкі ўсіх мерапрыемстваў савецкай улады належала палітыка-асветным установам. Іх структура, а таксама формы і метады працы былі аўтаматычна пашыраны на заходнія раёны і таму захавалі недахопы і характэрныя рысы, якія яны набылі за 20-гадовы савецкі перыяд. Тое ж самае можна сказаць і аб большасці з 31 тыс. спецыялістаў у розных галінах эканамічнага і сацыякультурнага жыцця, якія былі накіраваны ў заходнія вобласці з БССР і нават з СССР і якія не вельмі дакладна ўяўлялі мясцовыя ўмовы [3, с. 260]. Галоўнай мэтай палітасветустаноў заставалася мэтанакіраванае фарміраванне светапогляду савецкіх людзей, а ў сувязі з тым, што заходнебеларускае насельніцтва таксама стала лічыцца савецкім, то гэтая задача распаўсюджвалася і на яго. У выніку трэба прызнаць пашырэнне пэўных элементаў культурнай рэвалюцыі ў новым рэгіёне.

Ужо 19 лістапада 1939 г. ЦК КП(б)Б прыняў рашэнне аб стварэнні хат-чытальняў, бібліятэк, клубаў, і на гэтыя мэты ў 1940 г. было выдзелена 17,5 млн. руб. [2, с. 88]. Можна дапусціць, што да стварэння сеткі палітыка- і культурна-асветных устаноў далучаліся і сродкі насельніцтва, таму што ў 1939 г. на іх у БССР будаваліся 112 устаноў, а ў 1940 г. – 153 [2, с. 89].

Аб павелічэнні колькасці паліт- і культасветустаноў у БССР сведчыць параўнанне лічбаў, прыведзеных у даследаванні Л.М.Рагачовай: у 1938 г. дзейнічалі 930 сельскіх клубаў, 1304 хаты-чытальні, 90 раённых Дамоў культуры, 4042 бібліятэкі; у 1941 г. – каля 1200 сельскіх клубаў, 2438 хат-чытальняў, 195 раённых Дамоў культуры і 4172 бібліятэкі [2, с. 86, 91]. Нам падаецца, што большую частку розніцы паміж згаданымі лічбамі можна аднесці на карысць заходніх раёнаў. Як і ў СССР, агульнае ідэалагічнае кіраўніцтва і кантроль за дзейнасцю гэтых устаноў ажыццяўлялі аддзел прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б і адпаведныя аддзелы ў абласных і раённых камітэтах партыі. Прадаўжала існаваць і пэўная блытаніна ў агульнай рубрыкацыі гэтых устаноў і іх работнікаў, таму што ў розных дакументах першыя называліся культурна-асветнымі, а другія – палітасвет-работнікамі. Адзначым, што да 1946 г. асноўны кірунак работы сярод дарослых называўся палітыка-асветным, і ўстановы, якія яго ажыццяўлялі, называліся палітыка-асветнымі.

Мабыць, самым простым было стварыць структуру палітасветустаноў, а наладзіць эфектыўную працу аказалася намнога цяжэй. Напрыклад, у ліпені 1940 г. была прынята пастанова ЦК КП(б)Б, у якой прызнаваліся відавочныя недахопы ў арганізацыі палітыка-асветніцкай работы, асабліва ў сельскай мясцовасці. Ліквідаваць іх прапаноўвалася праз актыўнае далучэнне грамадскасці да распрацоўкі планаў палітасветустаноў, дзейсны кантроль за іх выкананнем, каардынацыю работы розных устаноў па ажыццяўленні "ўсебаковага развіцця асобы" [2, с. 93].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Можна было прымаць шматлікія, падрабязна распрацаваныя пастановы аб ажыццяўленні палітыка-асветніцкай работы, аднак паўставала сур'ёзная праблема кадраў. Безумоўна, у Дамы культуры ці гарадскія клубы кадры былі падабраны, у большасці накіраваны з усходніх раёнаў. Астатнія сотні ўстаноў, асабліва хаты-чытальні, сельскія клубы, засталіся без падрыхтаваных кадраў. Не спраўлялася з гэтай задачай адзіная ў БССР Магілёўская палітасветшкола, у якой на 1 студзеня 1941 г. навучаліся 265 слухачоў. Галоўным сродкам першаснага азнаямлення з прафесіяй з'яўляліся курсы па падрыхтоўцы бібліятэкараў, хатнікаў, клубных работнікаў, на якіх летам 1940 г. навучаліся каля 400 чалавек. [2, с. 99].

Метадычную дапамогу нізавым палітасветработнікам аказвалі Беларускі рэспубліканскі кабінет палітасветработы і абласныя камітэты, створаныя восенню 1940 г. Настойліва рэкамендаваліся масавыя формы работы: відовішчныя святкаванні рэвалюцыйных дат і іншых важных падзей у палітычным жыцці краіны, кампаніі ў форме тыднёвікаў, масавыя мітынгі і сходы. Як метады палітыка-асветніцкай работы разглядаліся тэматычныя гутаркі, паказы дакументальных кінастужак, выпуск насценных газет, арганізацыя выстаў і інш.

Аднак паралельна з палітычным асветніцтвам была арганізавана і культурна-асветніцкая работа, таму што не прымаць да ўвагі факт глыбокага ўкаранення традыцыйнай культуры ў дадзеным рэгіёне было немагчыма. Распаўсюджваць сярод мясцовага насельніцтва здабыткі савецкай культуры і мастацтва былі заклікаными Дамы народнай творчасці (ДНТ), створаныя ў абласцях, якія падпарадкоўваліся Упраўленню па справах мастацтваў пры СНК БССР. Якія кадры працавалі ў гэтых установах, разгледзім на прыкладзе Пінскага ДНТ. Штат яго складаўся з 8 чалавек: загадчыка, метадыстаў па танцах, выяўленчым мастацтве і па агульных кірунках, сакратара, бухгалтара і прыбіральшчыцы. Загадчык Ф.Г.Гінзбург меў няпоўную сярэднюю адукацыю, толькі адзін з метадыстаў вучыўся па спецыяльнасці ў Мастацкай акадэміі ў г. Кракаве [1б, л. 13].

Дамы народнай творчасці займаліся многімі пытаннямі і ажыццяўлялі кіруючыя функцыі, выкарыстоўваючы папярэдні вопыт: праводзілі інструктыўныя нарады, іншыя нарады, напрыклад з народнымі ткачыхамі, творчыя нарады, нарады-кансультацыі на месцах, і асабліва актыўна рассылалі метадычныя пісьмы па розных пытаннях: аб падрыхтоўцы да выбараў, алімпіяд самадзейнага мастацтва, да святкавання 8 Сакавіка, 1 Мая, чарговай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, Сталінскай Канстытуцыі, давалі парады аб арганізацыі гурткоў, падбіралі і рассылалі п'есы, розныя патрэбныя рэчы – паперу, алоўкі, гіпс, клей, ніткі і г.д. [1г, л. 4]. Перад ДНТ ставілася задача вывучэння і фіксацыі матэрыялу розных жанраў народнай творчасці. Праз кароткі тэрмін, напрыклад, Пінскі ДНТ кіраваў творчай дзейнасцю 14 самадзейных харавых і 2 танцавальных калектываў, 3 струнных і 3 духавых аркестраў і іншых аб'яднанняў. Агульная колькасць іх – 83. Гэты Дом народнай творчасці кіраваў таксама самадзейнымі артыстамі [1г, л. 2]. (Мы ўжываем азначэнне самадзейны, а не аматарскі згодна тагачаснай традыцыі.) Самадзейныя мастацкія аб'яднанні ствараліся пераважна моладдзю з вялікім энтузіязмам і адказнасцю, таму што справа была новая і цікавая. Безумоўна, падобная ініцыятыва існавала і "за польскім часам", аднак да яе далучаліся ў асноўным заможныя колы насельніцтва, а ў нашым выпадку – наадварот.

Формы і метады дзейнасці Дамоў народнай творчасці ў БССР хутка распаўсюдзіліся і ў Заходняй Беларусі. Ужо ў сакавіку 1940 г. былі арганізаваны абласныя алімпіяды мастацкай самадзейнасці, якім папярэднічалі раённыя агляды. Падрабязныя метадычныя ўказанні былі разасланы абласным ДНТ. Лепшыя калектывы і салісты былі накіраваны на Усебеларускую алімпіяду, якая праходзіла з 9 па 15 красавіка 1940 г., а лепшыя з лепшых былі адабраны для ўдзелу ў дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве. Удзельнічалі ў алімпіядах і народныя ткачыхі, вышывальшчыцы, скульптары, мастакі. На ВДНГ і выставу, якая адбылася падчас дэкады, толькі з Пінскай вобласці былі адабраны 44 экспанаты і 17 карцін самадзейных майстроў і мастакоў, сярод іх карціна пад назвай "Ленін і Сталін – арганізатары беларускай дзяржаўнасці" [1г, л. 2 адв.].

Першы вопыт аглядаў і алімпіяд быў абмеркаваны на высокім узроўні з заслухоўваннем сур'ёзных дакладаў аб развіцці самадзейнага мастацтва ў заходніх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абласцях БССР, аб выніках дэкады беларускага мастацтва і г.д. Было б няправільна лічыць, што самадзейныя мастацкія калектывы займаліся толькі творчасцю. Наадварот, яны з'яўляліся актыўнымі ўдзельнікамі разнастайных масавых дзяржаўных мерапрыемстваў, перш за ўсё выбараў у шматлікія органы новай улады. Канцэртнае абслугоўванне выбарчых участкаў было ганаровым абавязкам самадзейных артыстаў.

Адначасова з узнікненнем самадзейных гурткоў у галіне музычнага і харавога мастацтва ствараліся і тэатральныя гурткі. Аналагічна вышэйапісанай схеме адбываўся і працэс падрыхтоўкі да Усесаюзнага агляду тэатральнай самадзейнасці. Галоўнай задачай арганізатары Усесаюзнага агляду ставілі неабходнасць "уздыму творчага ўзроўню самадзейных калектываў у барацьбе за мастацтва сацыялістычнага рэалізму" [1г, л. 1]. У ліпені 1940 г. ДНТ рассылалі метадычныя пісьмы, ажыццяўлялі выезды на месцы, адбіралі лепшых. Рэпертуар большасці гурткоў складаўся з п'ес на ваенную тэматыку. У выніку двух тураў адборачнага конкурсу з 28 самадзейных тэатральных гурткоў Піншчыны на рэспубліканскі конкурс паехалі два: гурток клуба чыгуначнікаў з п'есай "У лесе " (аўтар Малчанаў) і гурток ваенізаванай аховы рачнога параходства з п'есай "Маці" (аўтар Назараў) [1г, л. 6].

У галіне самадзейнай тэатральнай творчасці стала вядома ініцыятыва знакамітых народных артыстаў СССР В.В.Барсавай і І.М.Масквіна аб шэфскай дапамозе майстроў прафесійнага мастацтва самадзейным артыстам. Аднак у адрозненне, напрыклад, ад Масквы, дзе шэфскі рух набыў сапраўды шырокі размах і энтузіязм, у БССР была праведзена нарада майстроў мастацтваў, прадстаўнікоў клубаў і кіраўнікоў тэатральных гурткоў, на якой было прынята рашэнне аб замацаванні майстроў за падшэфнымі калектывамі, створаны савет па кіраўніцтве шэфствам, на гэтым справа і спынілася [1а, л. 7].

Кіруючыя органы, як і два дзесяцігоддзі назад, прадаўжалі вызначаць рэпертуар самадзейных тэатральных калектываў праз падбор і рассылку п'ес, напрыклад "Анюціны вочкі" Левіна, "Змена" Князева, "Лес" Астроўскага, "Маці сваіх дзяцей" Афінагенавай, зборнікаў аднаактовых п'ес "Родная зямля", зборнікаў п'ес Чэхава, Каратыгіна і інш. [1г, л. 4].

Праз кароткі час самадзейныя артысты сталі сведкамі незразумелай для многіх з'явы, калі пачалі прыходзіць загады Галоўнага ўпраўлення па кантролі за відовішчамі і рэпертуарам, у якіх рэкамендавалася зняць з пастаноўкі п'есы, напрыклад "Гібель эскадры" Карнейчука, "Карані капіталізма" Зошчанкі ці п'есы Шоў, Катаева і інш. [1в, л. 19, 28].

Тое ж самае можна сказаць і аб рэпертуары музычных гурткоў, якім зноў жа праз ДНТ рассылаліся зборнікі ваенных песень, песень савецкіх кампазітараў. Нечаканасцю для Дамоў народнай творчасці было пісьмо, якім забаранялася выконваць такія песні, як, напрыклад, "Мы – камсамол", "Песня спартакаўцаў", "Песня чырвоных франтавікоў", "Пісьмо Варашылаву", "Бірабіджанская калыханка" і інш. [1в, л. 17].

У культурным жыцці заходнебеларускіх раёнаў узнікла яшчэ адна праблема, якой занялася пракуратура, – канцэрты так званых "дзікіх калектываў", што без дазволу выступалі ў розных населеных пунктах, з рэпертуарам, забароненым да выканання, прадавалі білеты, а выручкай не дзяліліся з дзяржавай [1в, л. 37]. Патрабавалася ўзяць пад кантроль гастрольную дзейнасць падобных груп.

Такім чынам, вызваленчы паход Чырвонай Арміі, які пачаўся 17 верасня і завяршыўся на працягу тыдня, прывёў да надзвычай хуткай змены палітычнай і сацыякультурнай сітуацыі ў Заходняй Беларусі. У гісторыі, мабыць, не знойдзецца такога выразнага прыкладу актыўнай падтрымкі насельніцтвам прыходу арміі іншай краіны, аднак, на наш погляд, самае незвычайнае заключаецца ў маланкавай замене адной палітычнай, сацыяльнай, эканамічнай і культурнай сістэмы на супрацьлеглую і настолькі ж хуткае распаўсюджанне, станаўленне і ўмацаванне апошняй. Хаця адмаўляць наяўнасць негатыўных настрояў у заходнебеларускім грамадстве няма падстаў, аднак большасць насельніцтва падтрымала савецкую ўладу і паверыла ёй.

Падзеі ў галіне палітычнага і культурнага асветніцтва ў заходніх раёнах БССР выразна адлюстроўваюць наступнае: па-першае, імклівае распаўсюджванне адпаведных структур у новым сацыякультурным асяроддзі; па-другое, у гэтым працэсе амаль не ўлічваліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

палітычныя і іншыя асаблівасці рэгіёну; па-трэцяе, энтузіязм, выкліканы новым укладам жыцця, асабліва сярод моладзі, эфект навізны садзейнічалі дастаткова безбалючаму ўкараненню ў сацыякультурнае жыццё Заходняй Беларусі напрацаваных за савецкі перыяд формаў і метадаў розных відаў асветніцтва.

---


1. *Навукова-метадычная* ўстанова "Занальны архіў у г. Пінску":

а) фонд 211, вопіс 1, справа 1;

б) фонд 211, вопіс 1, справа 5;

в) фонд 211, вопіс 1, справа 6;

г) фонд 211, вопіс 1, справа 11;

д) фонд 249, вопіс 1, справа 185.

2. *Рогачева, Л.М.* Культурное строительство в Беларуси: состояние и проблемы (на материалах общественно-политических организаций). 1938 – июнь 1941 г.: автореф. дис. …канд. ист. наук: 07.00.01 / Л.М.Рогачева; БГУ. – Мн., 1992. – 158 с.

3. *Нарысы* гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П.Касцюк [і інш.]; Ін-т гісторыі АНБ. – Мн.: Беларусь, 1995. – Ч. 2. – 560 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ